КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# [ ПРАЕКТ ]
# Дэкларацыя аб падтрымцы працы незалежных медыя

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

Мы, прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сілаў, выказваем сваю падтрымку беларускім незалежным медыя, якія працягваюць сваю працу ў надзвычайна неспрыяльных умовах.

Злачынны і нелегітымны рэжым Лукашэнкі атакуе незалежныя медыя. Сотні журналістаў зазналі палітычныя рэпрэсіі за сваю дзейнасць, дзясяткі дагэтуль знаходзяцца за кратамі. З ціскам і рэпрэсіямі сутыкаюцца таксама сваякі журналістаў і блогераў, якія выехалі за мяжу.

Медыя не маюць магчымасці тэлевізійнага ці радыёвяшчання ў Беларусі, як і выдавацца на паперы. Сайты незалежных медыя заблакаваныя, іх матэрыялы і старонкі ў сацсетках прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі. Медыя ізаляваныя ад беларускага рэкламнага рынку, а данаты ад чытачоў разглядаюцца як злачынства і нагода для пераследу за фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці.

- Мы падкрэсліваем сваю павагу да незалежнасці рэдакцыйнай палітыкі СМІ, у тым ліку іх магчымасці даваць пляцоўку для матэрыялаў і дыскусіяў, якія крытычныя ў адносінах да палітыкаў. Мы разумеем, што гэта натуральная частка дэмакратычнага грамадства.
- Мы адзначаем неабходнасць праграмнай і інстытуцыйнай фінансавай дапамогі для медыя і блогераў ад міжнародных партнёраў. Праца медыя вельмі важная, і ў цяперашніх умовах не можа быць у дастатковым аб’ёме прафінансаваная іншымі шляхамі.
- Мы падтрымліваем імкненне да разнастайнага інфармацыйнага ландшафту, заснаванага на дэмакратычных каштоўнасцях, які з'яўляецца неабходным для супрацьдзеяння прапагандзе і дэзынфармацыі рэжыму.
- Мы звяртаем увагу на надзвычайную важнасць у сённяшнім свеце забяспечваць медыя магчымасць распаўсюду інфармацыі з дапамогай тэхналагічных платформаў. Новыя тэхналогіі мусяць дапамагаць распаўсюду свабоднай інфармацыі, а не прапаганды. Таму мы заклікаем міжнародныя тэхналагічныя кампаніі да супрацоўніцтва з беларускімі незалежнымі медыя.
- Мы асобна падкрэсліваем важнасць захавання і падтрымкі тэлеканала «Белсат» – унікальнага праекта польскай дапамогі, дзякуючы якому мільёны беларусаў і беларусак атрымліваюць доступ да непадцэнзурнай інфармацыі.